*Гоўзіч І.М.*

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА. V КЛАС



## РАЗДЗЕЛ II. ВУСНАЯ НАРОДНАЯ ТВОРЧАСЦЬ

1. **Падрыхтуйце казку, падбярыце ілюстрацыі да яе і аформіце ў выглядзе кніжкі.** Пры напісанні казкі кіруйцеся наступнымі парадамі:

***Парады юнаму казачніку***

1) Падумай, якая казка ў цябе павінна быць — чарадзейная, бытавая, пра жывёл.
2) Падбяры назву казцы.
3) Героі казкі.
4) Падумай, якія казачныя прадметы будуць дапамагаць героям.
5) Асноўная думка казкі.
6) Паслядоўнасць дзеяння.
7) Выкарыстай у казцы фальклорныя выразы.
8) Намалюй да асноўных эпізодаў казкі ілюстрацыі.

2. **Уявіце, што вы знаходзіцеся ў тэатры**, сядзіце ў сваім крэсле і чакаеце пачатку казкі «Разумная дачка» (ці «Залаты птах»). І вось нарэшце ўздымаецца заслона паспрабуйце акаўаць на пытанні ці намаляваць малюнкі:

1. Як выглядае сцэна.
2. Як выглядаюць галоўныя героі.

Або Вы мастак тэатра, якія б вы распрацавалі касцюмы для герояў, які падабралі б грым.

3. **Перакажыце самы любімы вамі эпізод** казкі «Залаты птах» ад імя галоўнага героя Івана (або эпізод «Разумнай дачкі» ад імя дзяўчынкі). Перад пераказам падумайце, які характар, знешнасць героя, ад імя якога будзе весціся апавяданне.

4. **Праінсцыніруйце** казку «Музыкі».

5. **Адшукайце і запішыце ў літаратурны сшытак казку, якую Вам або Вашай матулі (таце) расказвалі перад сном**. Казку назавіце «Любімая казка маёй матулі…». Намалюйце некалькі ілюстрацый да яе і паспрабуйце стварыць яе ў выглядзе кнігі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

5. **Намалюйце слоўны партрэт** галоўных герояў легенды «Нарач» (Найрыты, Андрэя, пана) па наступным плане:

1. Знешнасць.
2. Узост.
3. Рысы характару.
4. Асаблівасці мовы.

6. Складзіце **цытатную характарыстыку вашых любімых казачных герояў** (казка на выбар) у выглядзе табліцы:

| Назва казкі | Імя героя | Рыса характару | Цытата |
|---|---|---|---|
| | | | |

7. Самастойна адшукайце і падрыхтуйце **выразнае чытанне** легенды вашай мясцовасці (пра горад, вёску, раку, возера і г.д.).

Пасля чытання легенд вучні класа павінны выбраць самую цікавую з усіх расказаных.

8. Самастойна **складзіце загадкі** да слоў «Кніга», «Школа», «Дзверы», «Нажніцы», «Кот». Намалюйце **ілюстрацыі** да іх.

9. Арганізуйце **віктарыну «Разумніцы і разумнікі»**. Прынясіце на ўрок 5 загадак. Выберыце вядучага, які будзе чытаць прынесеныя Вамі загадкі. Падзяліцеся на каманды па 5—6 чалавек у кожнай. Падбярыце назву сваёй камандзе. Перамагае тая каманда, якая набрала больш правільных адказаў.

10. Напішыце **сачыненне-мініяцюру па прыказцы «Людзей слухай, а свой розум май»**.

Выкарыстайце пры яго напісанні словы: сябар, маці, гуляць, забыць, настаўніца, кантрольная).

11. **Вы — рэдактар часопіса «Здагадайка», выпраўце памылкі ў адказах да загадак**.

а) Усіх нас корміць, а сама есці не просіць. Мама. (Зямля)
б) Хутка грызе, дробна жуе, а не глытае. Вавёрка (Піла)
в) Яны чорныя, крывыя,
З нараджэння ўсе нямыя,
А калі пастануць поруч,
Як жывыя загавораць. Гукі (Літары)

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

г) Дзень і ноч сакоча, а есці не хоча. Конік. (Гадзіннік)

12. **Расстаўце словы ў такім парадку, каб атрымаліся сказы**. Напішыце, да якіх твораў, што вы вывучалі можна аднесці гэтыя сказы.

а) даражыць, кожнага, сваёй, задача, чалавека, сумленна, радзімай, жыць. (Задача кожнага чалавека сумленна жыць, даражыць сваёй радзімай).

б) прыродай, яе, прыгажосць, роднай, заўважаць, зямлі, захапляцца. (Заўважаць прыгажосць роднай зямлі, захапляцца яе прыродай).

13.Запоўніце кластар:




РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ